ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

ТРАКТАР «БЕЛАРУСЬ» У ІНДЫІ

Беларускія хлопцы яго змайстравалі,
Увабраў ён, як волат, прастораў размах.
Ён уважна глядзіць на паўдзённыя далі,
Не бываў ён у гэтых дзівосных краях.

Ён прыйшоў, як сваяк,
не з пуцёўкай турысцкай –
На жыццё і на працу. Надоўга. Навек.
Зразумее ён мову прыроды індыйскай –
Трысняговага поля, і джунгляў, і рэк.

Трактарыст падышоў
і пагладзіў спачатку
Руль бліскучы
і корпус, што фарбаю ззяў.
Усміхнуўся шырока.
“Машына ў парадку!” –
Ён па-руску, на мове ламанай сказаў.

І нібы забасілі гудкі з Беларусі,
Беларускія пушчы нібы загулі.
Быццам трактар здалёку
на Мінск азірнуўся
І пайшоў па гарачай вялікай зямлі.

Чарнавокія дзеці крычалі:
“Зірніце!”
Даганялі,
прасілі, каб дзядзька падвёз.
Усміхалася сонца ў высокім зеніце,
Быццам слухала шум беларускіх бяроз.

1958